

1 лютага ў аддзяленні дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту ТЦСАН адбылася цікавая сустрэча, прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Высоцкага. Мерапрыемства арганізавалі і правялі супрацоўнікі аддзялення дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту разам з загадчыцай аддзела абслугоўвання і інфармацыі раённай бібліятэкі Таццянай Райчонак і бібліятэкарам гэтага аддзела Святланай Шчуравай. Песні Уладзіміра Высоцкага прагучалі ў выкананні Алены Калеснікові, педагога раённага цэнтра дзяцей і моладзі. Супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі літаратурна-музычную кампазіцыю, прысвечаную жыццю і творчасці аўтара. Успаміны пра гэтага чалавека, яго вершы і песні, старонкі творчай біяграфіі – шчырая атмасфера сустрэчы нікога не пакінула раўнадушным. Словы ўдзячнасці за надзвычай цікавае мерапрыемства арганізатарам выказалі прыхільнікі творчасці вядомага музыканта — наведвальнікі аддзялення дзённага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту.





